# Радовішчы Міколы Аўрамчыка

100 гадоў таму 14 студзеня ў вёсцы Плёсы Бабруйскага раёна нарадзіўся будучы літаратар, заслужаны работнік культуры Беларусі, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Янкі Купалы Мікола Аўрамчык. З нагоды юбілею ў розных установах краіны быў арганізаваны шэраг памятных мерапрыемстваў.

У зале беларускай літаратуры Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі з 3 студзеня па 19 лютага праходзіць прысвечаная юбіляру кніжная выстаўка «Голас вернасці». Кніжная спадчына аўтара прадстаўленая ў раздзеле «Запрашэнне да роздуму», куды ўвайшлі кніга вершаў «Сустрэчы былых канагонаў», раман «У падзямеллі», аповесць «Палон», зборнікі вершаў «Пярэдні край», «Шляхамі дружбы», «Ключы жураўліныя», «Універсітэцкі гарадок», «Радовішча», «Агледзіны», «Запрашэнне да роздуму» і інш. Раздзел «Майстар беларускай паэзіі» склалі пераклады з Дж. Байрана, А. Міцкевіча, І. Франка, М. Джаліля, Л. Украінкі, М. Рыльскага і інш. Матэрыялы аб жыцці і творчасці выкладзеныя ў раздзеле «Нам засталася спадчына».

У дзень народзінаў літаратара ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адбылася літаратурная вечарына памяці М. Аўрамчыка, да якой прымеркавалі адкрыццё выстаўкі «У Доме Якуба Коласа». Назву выстаўкі абралі з радка верша юбіляра, які ён прысвяціў гаспадару і яго дому. Экспазіцыю выстаўкі склалі кнігі Міколы Якаўлевіча, матэрыялы з фондаў музея, асабістага архіва нашчадкаў Якуба Коласа, прыватнай калекцыі сям'і юбіляра.

У вечарыне, якую адкрыў дырэктар музея Аляксандр Храмы, прынялі ўдзел і выступілі празаік Генрых Далідовіч, паэты Кастусь Цвірка (галоўны рэдактар выдавецтва «Кнігазбор»), Казімір Камейша, Міхась Пазнякоў (старшыня савета Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі), Яўген Хвалей, Алесь Камароўскі, журналіст Святлана Воцінава (галоўны рэдактар часопіса «Маладосць»), унучка Якуба Коласа Марыя Міхайлаўна Міцкевіч, нашчадкі М. Аўрамчыка. Пад час імпрэзы прагучалі вершы юбіляра «У Доме Якуба Коласа», «Адлёт жураўлёў» і інш.

Вечарыну аздобілі студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Уладзіслаў Баркевіч і Ірына Цераш, якія выканалі пяць лірычных інтэрмецца кампазітара Дзмітрыя Смольскага на словы Генрыха Гейнэ.

15 студзеня ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры ладзілі вечарыну «Сведка эпохі» ў рамках праекта «Дыяменты прыгожага пісьменства», якую правёў навуковы супрацоўнік музея Андрэй Мельнікаў. Пра свае сустрэчы і стасункі з Міколаем Якаўлевічам распавялі ўнук Аркадзя Куляшова, стваральнік і кіраўнік гурта «Літвіны» Уладзімір Бярбераў, калегі па літаратурнай працы Анатоль Вярцінскі, Г. Далідовіч, Васіль Зуёнак, К. Камейша. Аб працы М. Аўрамчыка на пасадзе рэдактара аддзела паэзіі ў часопісе «Маладосць» распавяла С. Воцінава. Словы пра бацьку ад нашчадкаў юбіляра выказала малодшая дачка – Наталля. Музею падаравалі кнігі, асабістыя рэчы і юбілейны медаль удзельніку Вялікай Айчыннай вайны.

17 студзеня ў Бабруйскім краязнаўчым музеі «Гадзіну памяці» земляка адзначылі імпрэзай, у назву якой абралі радок з верша юбіляра «Як тут хлебам, мёдам і грыбамі пахне навакол сама зямля...». Да мерапрыемства сумесна з супрацоўнікамі бібліятэкі № 8 імя Ефрасінні Полацкай была падрыхтаваная выстаўка твораў М. Аўрамчыка, фота і іншыя дакументы.



*Малодшая дачка М. Аўрамчыка Наталля*


*Г. Далідовіч, Я. Хвалей, А. Камароўскі*

*Наталі КУПРЭВІЧ, фота аўтара*